

Раздзел VI

# ГІСТОРЫЯ СССР І РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

## § 33. СССР у 1945—1953 гг.

*1. Якія краіны былі саюзнікамі СССР у гады Другой сусветнай вайны? 2. Што такое «халодная вайна»?*

СССР выйшаў з Другой сусветнай вайны звышдзяржавай. Савецкая сфера ўплыву пашырылася ад Балтыкі да Балканаў. Але перамога не прынесла стомленаму народу ўсяго таго, на што ён так спадзяваўся. Камандна-адміністрацыйная сістэма кіравання ў цэлым так і засталася без змяненняў. А галоўнай задачай, якая стаяла перад краінай у першыя пасляваенныя гады, было аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

**Аднаўленне народнай гаспадаркі.** У гады Вялікай Айчыннай вайны СССР панёс велізарныя людскія страты. На франтах вайны і на акупаваных тэрыторыях загінулі амаль 27 млн чалавек. Усяго за гады вайны насельніцтва краіны скарацілася з 196,8 да 162,4 млн чалавек.

Незлічонымі былі і матэрыяльныя страты. У руінах ляжалі 1700 гарадоў, больш за 70 тыс. вёсак. Засталіся без пры-



Жыхары Мінска расчышчаюць ад руін вуліцы горада. 1944 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

тулку больш за 25 млн чалавек. Былі разбураны амаль 32 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, якія давалі напярэдадні вайны 70 % усёй вытворчасці сталі і 60 % вугалю. У ходзе вайны са строю было выведзена 65 тыс. км чыгуначных пуцей. Прадукцыя сельскай гаспадаркі ў 1945 г. складала каля 60 % ад даваеннага ўзроўню.



Першы савецкі аўтобус ЗІС-154. 1946 г.

Цяжкае аднаўленне народнай гаспадаркі ўскладняла вельмі моцная засуха 1946 г., якая прывяла да голаду і людскіх страт у асобных рэгіёнах еўрапейскай часткі СССР. У той жа час нарастала «халодная вайна», і нядаўнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі прыпынілі пастаўкі ў СССР сыравіны, тэхнікі і прамысловага абсталявання. Савецкаму народу даводзілася разлічваць толькі на ўласныя сілы. На Захадзе прадказвалі, што СССР спатрэбіцца не менш як 25 гадоў, каб аднавіць разбураную вайной эканоміку і дасягнуць даваеннага ўзроўню.

Цаной вялікіх намаганняў былі адбудаваны старыя і створаны новыя магутныя прамысловыя прадпрыемствы. Як і ў 1930-я гг., асноўная ўвага надавалася сталеліцейнай, вугальнай прамысловасці і цяжкаму машынабудаванню, а таксама развіццю навукі, тэхналогій і ўзбраенняў.

Усяго за гады чацвёртай пяцігодкі (1946—1950) былі адноўлены і нанава пабудаваны 6200 вялікіх прадпрыемстваў. Паводле афіцыйных звестак, узровень прамысловай вытворчасці ў 1950 г., уключаючы рэпарацыі і прадукцыю сумесных савецка-ўсходнегерманскіх прадпрыемстваў, перавысіў даваенныя паказчыкі на 73 %.

Адраджэнне народнай гаспадаркі ажыццяўлялася звычайнымі камандна-адміністрацыйнымі метадамі і шмат у чым адбывалася за кошт аграрнага сектара. Цэны на прамысловую прадукцыю штучна завышаліся, а дзяржаўныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, наадварот, штучна зніжаліся і мелі сімвалічны характар. Шырока выкарыстоўвалася прыцягненне працоўнай сілы ваенных і зняволеных.


ПРАВДА

Орган Центрального Комитета Коммунистической партии Советского Союза

...ВОЕ СНИЖЕНИЕ ...ОЗНИЧНЫХ ЦЕН

В Совете Министров Союза ССР и Центральном Комитете Коммунистической партии Советского Союза

О НОВОМ СНИЖЕНИИ ГОСУДАРСТВЕННЫХ РОЗНИЧНЫХ ... НА ПРОДОВОЛЬСТВЕННЫЕ И ПРОМЫШЛЕННЫЕ ТОВА...

ХЛЕБ ПЕЧЕНЫЙ, МУКА И МАКАРОНЫ

КРУПА, РИС, БОБЫ И ПИЩЕВЫЕ КОНЦЕНТРАТЫ

ГАЛАНТЕРЕЙНЫЕ ТОВАРЫ

МЫЛО, ПАРФЮМЕРНО-КОСМ... И ТАБАЧНЫЕ ИЗДЕ...

Газета «Правда» ад 1 красавіка 1953 г. З 1946 г. у СССР сталі рэгулярна зніжацца цэны на прадметы першай неабходнасці

Правообладатель Издательский центр БГУ

Праца савецкіх людзей у першыя пасляваенныя гады мала адрознівалася ад працы ў ваенны час: пастаянны недахоп прадуктаў, цяжкія ўмовы побыту, распаўсюджванне захворванняў, высокі ўзровень смяротнасці. Многія сем'і жылі ў зямлянках і бараках. Сяляне амаль нічога не атрымлівалі за працу ў калгасе, існавалі ў асноўным за кошт дапаможнай гаспадаркі і прысядзібных участкаў. Пры гэтым кожная гаспадарка абкладалася падаткам. Калгаснікі не маглі свабодна перамяшчацца па краіне, бо не мелі пашпартоў, ім не плацілі пенсіі па ўзросце. Памеры іх прысядзібных гаспадарак і агародаў скарачаліся. З дапамогай прымусовых мер і цаной цяжкай працы мільёнаў сялян сельская гаспадарка краіны выйшла на даваенны ўзровень у пачатку 1950-х гг.

Аднак пагроза ядзернага нападу і гонка ўзбраенняў аказвалі адмоўны ўплыў на развіццё народнай гаспадаркі. Эканоміка па-ранейшаму была моцна мілітарызаванай. У краіне выраблялася недастаткова прадметаў народнага спажывання. Падтрымліваць высокія тэмпы развіцця можна было толькі за кошт эксплуатацыі ўнутраных рэсурсаў, што ў будучым пагражала эканамічнай катастрофай.

**Палітычнае развіццё краіны.** У галіне ўнутранай палітыкі савецкае кіраўніцтва вымушана было лічыцца з думкамі і пачуццямі савецкіх людзей, якія прайшлі Вялікую Айчынную вайну. Многія з іх пабывалі за мяжой, убачылі іншую рэчаіснасць. Немалаважным было ўсведамленне таго, што менавіта савецкі народ зрабіў вялікі ўнёсак у перамогу над фашызмам.

У пасляваенны перыяд барацьба з рэлігіяй стала не такой жорсткай, людзі пачалі больш свабодна выказвацца. У краіне намеціўся паступовы адыход ад прынцыпаў дыктатуры пралетарыяту. Найбольш яскрава гэты працэс праявіўся ў адмове ад гра-



І. В. Сталін выступае на заключным пасяджэнні XIX з'езда КПСС. 14 кастрычніка 1952 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ

мадска-палітычных тэрмінаў, уведзеных бальшавікамі, і вяртанні да агульнапрынятых у сусветнай практыцы.

І. В. Сталін лічыў, што пасля перамогі ў вайне завяршыўся пераходны этап у жыцці савецкага грамадства і таму неабходна адмовіцца ад такіх паняццяў, як «народны камісар» або «камісарыят». У 1946 г. Савет Народных Камісараў СССР быў пераўтвораны ў *Савет Міністраў*. А XIX з'езд Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў), што адбыўся ў 1952 г., змяніў назву партыі. Цяпер яна стала называцца *Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза (КПСС)*, ужо без спасылкі на бальшавізм. У краіне рэгулярна пачалі праводзіцца выбары ў Вярхоўныя Саветы СССР і саюзных рэспублік, гэтым Саветам згодна з Канстытуцыяй належала ўся ўлада ў краіне.

Савецкі лідар сур'ёзна захапіўся ідэяй паступовага адхілення партыі ад непасрэднага кіравання краінай. Неканстытуцыйная пасада Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС была скасавана. Вышэйшай пасадай у Савецкім Саюзе стала пасада Старшыні Савета Міністраў СССР, якую займаў І. В. Сталін.

**Палітычныя рэпрэсіі.** Пасля 1945 г. у краіне зноў узмацніліся палітычныя рэпрэсіі.

Адным з самых гучных палітычных працэсаў пасляваеннага часу стала *«Ленінградская справа»*, развязаная ў *1949—1950 гг.* Асноўнай прычынай была празмерная незалежнасць ленінградскай партыйнай арганізацыі і яе намер адрадзіць рэальную дзяржаўнасць РСФСР з пераносам сталіцы Расіі ў Ленінград. Па «Ленінградскай справе» было арыштавана каля 2 тыс. чалавек. Амаль усіх партыйных кіраўнікоў Ленінграда абвінавацілі ў падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту і пакаралі смерцю.

У канцы 1940-х гг. у краіне пачалася кампанія па барацьбе з «бязродным касмапалітызмам». Ярлык «касмапаліт» у СССР навешвалі прадстаўнікам інтэлігенцыі, найчасцей асобам яўрэйскай нацыянальнасці. Касмапалітам маглі абвясціць любога чалавека, які цікавіўся заходняй культурай, мастацтвам, жывапісам. І толькі смерць І. В. Сталіна *5 сакавіка 1953 г.* спыніла новыя палітычныя рэпрэсіі.

**Знешняя палітыка.** Перамога ў вайне змяніла статус Савецкага Саюза на міжнароднай арэне. Ён стаў адным з лідараў сусветнай супольнасці, якія вызначалі пасляваеннае развіццё свету. Вырашальны ўнёсак СССР у перамогу ў Другой сусветнай вайне садзейнічаў росту сімпатый да яго на Захадзе.

У адказ на рост уплыву і ўмацаванне пазіцый Савецкага Саюза ў свеце ЗША і Вялікабрытанія ўзмацнілі палітыку стрымлівання «савецкай экспансіі». Карыстаючыся ядзернай манаполіяй, ваенна-палітычнае кіраўніцтва ЗША ўжо з 1945 г. распрацавала планы нанясення атамных удараў па СССР.

Нядаўнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі фактычна апынуліся ў стане неаб'яўленай вайны. Таму намаганні савецкага кіраўніцтва невыпадкова былі

Правообладатель Издательский центр БГУ



29 жніўня 1949 г. СССР ажыццявіў выпрабаванне атамнай бомбы

накіраваны на ўмацаванне ўласнай ваеннай магутнасці і найхутчэйшую ліквідацыю ядзернай манаполіі ЗША. Першае выпрабаванне атамнай зброі СССР у *1949 г.* стала важным стрымальным фактарам у развіцці савецка-амерыканскіх адносін, якія не дазволіў «халоднай вайне» перарасці ў «гарачую».

Доўгі час савецкае кіраўніцтва лічыла, што супярэчнасці паміж сацыялізмам і капіталізмам невырашальныя. Але бліжэй да канца жыцця І. В. Сталін крыху змяніў сваю пазіцыю па гэтым пытанні. У час карэйскай вайны ён заявіў аб сваім жаданні спыніць ваенныя дзеянні і сустрэцца з новым прэзідэнтам ЗША Д. Эйзенхаўэрам. Кіраўнікі вялікіх дзяржаў пачыналі разумець, што ад жорсткай знешняй палітыкі не выйграе ніхто.

1. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча СССР пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Якія праблемы паўсталі перад Савецкім Саюзам?
2. Колькі часу спатрэбілася СССР для таго, каб аднавіць разбураную вайной эканоміку? Якія фактары гэтаму садзейнічалі? Ахарактарызуйце вынікі аднаўленчага перыяду.
3. Якія змены адбыліся ва ўнутранай палітыцы савецкага кіраўніцтва?
4. Ці існавала рэальная апазіцыя вярхоўнай уладзе ў Савецкім Саюзе?
5. Растлумачце значэнне паняцця «касмапалітызм». Чаму пасля вайны пачалася барацьба з касмапалітамі?
6. Якія задачы ў галіне знешняй палітыкі савецкае кіраўніцтва лічыла прыярытэтнымі? Як вы думаеце, ці была распрацоўка ядзернай зброі СССР неабходнай?

Агульны стан савецкага грамадства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе можна ахарактарызаваць наступнымі словамі: надзея і расчараванне. Што ўсяляла ў савецкіх людзей надзею, а што выклікáла расчараванне?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**З пісьма членаў праўлення калгаса «Кызыл Маяк» Горна-Алтайскай аўтаномнай вобласці. 13 верасня 1948 г.**

Мы звяртаемся да Вас з просьбай растлумачыць, у чым прычына, што тут у нас з году ў год увесь ураджай даводзіцца здаваць, не размяркоўваць ні грама на працадні, чым падрываецца эканоміка калгасаў і падрываецца ў калгаснікаў жаданне працаваць. Мы разумеем, што ў перыяд вайны патрабавалася для забеспячэння арміі больш хлеба, мы з радасцю аддавалі ўсё… не шкадавалі нічога, каб перамагчы ворага. 1945—1946—1947 гг. — неўраджай — таксама здалі ўсё, каб як мага хутчэй аднавіць народную гаспадарку. 1948 г. — мы спадзяваліся, што ў гэтым годзе, выканаўшы дзяржаўны план хлебаздачы, зможам размеркаваць на працадні прыкладна па адным кілаграме. Цяпер мы дзяржаўны план выканалі датэрмінова на 200 %… Але, нягледзячы на гэта, абкам ВКП(б) і райкам давялі нам і ўсім калгасам цвёрдае заданне на звышпланавую здачу, якая перавышае ў некалькі разоў дзяржаўныя планы, таму на працадні размяркоўваць няма чаго, і нават насенне не хопіць засыпаць поўнасцю, каб пасеяць у 1949 г.

Калгаснікі… жывуць у вельмі цяжкіх умовах… хлеб не бачым, жывём на бульбе, а вясной канчаецца і бульба — пераходзім на траву…

*Якімі былі метады кіравання сельскай гаспадаркай, што выкарыстоўваліся ў СССР? Ахарактарызуйце ўзровень жыцця калгаснікаў. Якія вынікі для развіцця сельскай гаспадаркі мела такое кіраванне?*

## § 34. СССР у 1953 г. — сярэдзіне 1960-х гг.

*1. Якімі былі прыярытэты эканамічнага развіцця СССР у 1945—1953 гг.? 2. Які характар мелі адносіны паміж СССР і ЗША пасля Другой сусветнай вайны?*

Цэлая эпоха ў жыцці СССР завяршылася са смерцю І. В. Сталіна. Адсутнасць легітымных механізмаў перадачы вярхоўнай улады вы́клікала зацяжны крызіс і барацьбу ў вышэйшым кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Краіна стаяла на парозе вялікіх змен ва ўсіх сферах жыцця.

**СССР пасля смерці І. В. Сталіна.** Пасля смерці І. В. Сталіна паміж яго паплечнікамі разгарнулася жорсткая барацьба за ўладу. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ўзначалілі *Г. М. Маленкоў* і *Л. П. Берыя*. Абодва лідары выступалі за перадачу ўладных паўнамоцтваў ад партыйных структур да дзяржаўных. Былі спынены ўсе палітычныя працэсы, праведзена ўсеагульная амністыя. Берыя выказваўся за адмену калгаснага ладу і збліжэнне з Захадам.

Аднак у кіраўніцтве партыі пачала складацца змова супраць Берыі, якую ўзначаліў М. С. Хрушчоў, што займаў тады пасаду сакратара ЦК КПСС. У выніку

Правообладатель Издательский центр БГУ